НЁМАН СРЭБРАВОДНЫ...»

і пешшу ішоў Янка Купала, і як Павел Шпілеўскі паблытаў Стары і Новы Свержань

Школа ў Мікалаеўшчыне больш падобная на палац. Яна, пабудаваная па замове Коласа, носіць імя пісьменніка з 1947 года.

ТАЛЕНТЫ І ПРЫХІЛЬНІКІ

Калі ўжо пісаць пра мясціны Стаўбцоўшчыны, звязаныя з літаратурай і літаратарамі, нельга не згадаць установы адукацыі, прынамсі дзве школы. Тая, што ў вёсцы Мікалаеўшчына — а вёска, як ведаем з урокаў, мае да Якуба Коласа самае непасрэднае дачыненне, — уражвае ўжо з першага погляду сваёй архітэктурай. Не школа — палац, пабудаваны ў стылі сталінскага ампіру: двухпавярховы, з калонамі. У 1946 годзе яе пабудавалі ў Мікалаеўшчыне клопатамі самога Коласа. Гэта была першая двухпавярховая вясковая школа ў краіне. Калісьці ў яе хадзіла амаль чатырыста вучняў, цяпер — пяцьдзясят. Але «каласкі» нават у такім невялікім складзе з гонарам нясуць імя славутага земляка. У школе дзейнічае цікавы музей, у якім, вядома ж, і экспазіцыя, прысвечаная пісьменніку, і кнігі з аўтографамі нашых літаратараў. У 1966 годзе, да стагоддзя школы як установы адукацыі, тут ладзілася вялікая імпрэза. Свае кнігі з дарчымі надпісамі тут пакінулі Янка Брыль, Пімен Панчанка, іншыя славутыя пісьменнікі, што наведалі тады Коласаву школу. Не меншую ўвагу прыцягвае яшчэ адзін стэнд з кнігамі. Гэта — творы выпускнікоў Мікалаеўшчынскай школы. Яўген Хвалей, Мікола Маляўка, Алесь Камароўскі, Ніяна Загарэўская... Імёны ў сучаснай беларускай літаратуры вядомыя. А ўвогуле трыццаць тры выпускнікі з гонарам расказваюць у школе, маюць дачыненне да прыгожага пісьменства. Гэткая канцэнтрацыя талентаў у адным месцы, магчыма, стане калісьці прадметам асаблівага вывучэння.

У літаратурным музеі Дзераўнянскай школы ёсць нават адмысловая тэматычная карта раёна.

А ў Дзераўнянскай школе, што амаль на мяжы з Валожынскім раёнам, дзейнічае адмысловы музей «Стаўбцоўшчына літаратурная». Экспазіцыя зроблена дэталёва і цікава — тут вам і карта раёна з пазначанымі паселішчамі, што звязаныя з літаратурай, і гісторыі ўраджэнцаў гэтых мясцін, якія маюць да пісьменнікаў і пісьменніцтва дачыненне. Вось тут мы і высветлілі, што на Стаўбцоўшчыне карані не толькі Якуба Коласа, але і Янкі Купалы. Аказваецца, маці паэта Бянігна Іванаўна нарадзілася тут, у фальварку Няшота пад Рубяжэвічамі, а бацька Дамінік Ануфрыевіч арандаваў зямлю каля Цеснавой.

Сярод выпускнікоў школы — вядомыя пісьменнікі Казімір Камейша і Генрых Далідовіч. Яўген Карпуць, які жыве ў Стоўбцах, даволі часты госць у Дзераўной. Іх творы вучні актыўна выкарыстоўваюць пры правядзенні экскурсій па музеі — напрыклад, ставяць тэатральную пастаноўку паводле апавядання Далідовіча «Зіна». Музей, як і ўся школа, жыве актыўным жыццём — нават экскурсіі тут праводзяць не толькі на беларускай мове, але і на англійскай. У школе займаецца цяпер каля двухсот вучняў, і ўсе яны разам з настаўнікамі далучаныя да творчай, пошукавай, даследчыцкай працы. «Стварэнне інтэрактыўнай карты мікратапонімаў», «Лексічны слоўнік вёскі Дзераўная», «Сістэма пераносных значэнняў у творах Яўгена Карпуця»... Гэта работы не студэнтаў філфака, а вучняў звычайнай вясковай школы. Ёсць чаму здзівіцца, праўда?

ХРАМЫ ДЛЯ ШПІЛЕЎСКАГА І СЫРАКОМЛІ

Храмы ў Новым Свержані, падобныя паміж сабой, бы родныя браты, не нашмат змяніліся з часоў падарожжа Шпілеўскага.

Дарэчы, пра турыстаў. Неабыякавыя падарожнікі ездзілі па гэтай зямлі яшчэ задоўга да Коласавага нараджэння і ўжо тады знаходзілі тут нямала цікавага. Вось, напрыклад, Павел Шпілеўскі, наш славуты этнограф і публіцыст, які ў 1851 годзе праехаўся ад Варшавы да Ігумена (сённяшняга Чэрвеня) і напісаў нарыс «Падарожжа па Палессі і беларускім краі», які лічыцца адным з першых дакументальных этнаграфічных даследаванняў. Дык вось, у ваколіцах Стоўбцаў з шаноўным падарожнікам выйшла неспадзяванка — такі ўважлівы заўсёды ў дэталях, тут ён пераблытаў усё, што можна было пераблытаць. Быў у Новым Свержані, а напісаў, што ў Старым, паставіў два Свержані на розных берагах Нёмана, хоць насамрэч абедзве вёскі стаяць на адным баку ракі. Дакладней, Новы — на самім Нёмане, а побач са Старым працякае невялікая Залужанка...

Але галоўнае ў нашай вандроўцы тое, што ў Новым Свержані і сёння можна пабачыць храмы, якія сто семдзесят гадоў таму найбольш уразілі Паўла Шпілеўскага. (Ураза самага італьянца Бернардоні, які прычыніўся да нясвіжскіх уладанняў Радзівілаў. Успенская царква і Петрапаўлаўскі касцёл стаяць зусім побач адно ад аднаго, як браты-пагодкі. Яно так і ёсць — царква маладзейшая за касцёл толькі на два гады, з 1590-га. З 1511-м Шпілеўскі даў маху. Хоць, магчыма, на гэтым месцы стаяла іншая царква.

зілі нават мацней, чым местачковыя яўрэі, якія спрабавалі прадаць яму паркаль і дзёгаць.) «Пасярод мястэчка, на даволі значным узвышшы, амаль побач, стаяць два храмы. Адзін — праваслаўны, а другі — рымска-каталіцкі касцёл-фара. Фара вядзе свой пачатак ад 1588 года; падчас уладання мястэчкам Радзівіла Чорнага яна была ператворана ў кальвінісцкі храм. Што датычыцца праваслаўнай царквы, то, як сведчыць надпіс «1511» на цвінтарным помніку, які амаль урос у зямлю, пачатак існавання яе належыць аднесці да XVI стагоддзя, калі не раней...»

Храмы, простыя, як манахі-аскеты, былі пабудаваныя па праекце таго

Яшчэ адзін руплівец прыгожага пісьменства XIX стагоддзя Людвік Кандратовіч (ён жа Уладзіслаў Сыракомля), працуючы ў канцылярыі Радзівілаў, таксама шмат ездзіў па гэтых мясцінах і пісаў пра іх. «Сярод ураджайных раўнінных палёў ляжыць мястэчка Гавязна з прыгожай мураванай царквой», — чытаем у ягоным даследаванні «Нёман ад вытокаў да вусця». Гавязны ў навакольлі Стоўбцаў ужо няма — у 1964 годзе яна стала Вішняўцом. Перайменавалі як немілагучную, хоць мясцовыя бабулі сцвярджаюць, што тая, старая назва была ад слова «гавець» — вельмі набожныя тут заўсёды былі людзі. У Сыракомлі пра гэта не сказана нічога, але, калі даведваешся, што царква 1742 года пабудовы, якая сёння выглядае проста як цацка, была адрамантавана за кошт прыхаджан, якія збіралі грошы некалькі гадоў, пачынаеш у тое верыць. Прадцечанская царква — шыкоўнае беларускае барока — і сёння радуе вока і душу. Унутры захавалася з XVIII стагоддзя пакручастая вузенькая вітая лесвіца на хоры, на якіх апынаешся вочы ў вочы з намаляваным над алтаром Хрыстом. Выява Збаўцы новая, але Сыракомлю, які шмат увагі звяртаў на аздобу храмаў, яна б, напэўна, спадабалася.

Царква ў Гавязне ўражвала не толькі Уладзіслава Сыракомлю. «Мястэчка пад крыжам» — так звалі Гавязну ў навакольлі.

ПІСЬМЕННІК ФЕЛІКС ЭДМУНДАВІЧ

Зусім недалёка ад Дзераўной, калі ехаць на Івянец, ёсць яшчэ адно цікавае месца, куды варта завітаць. Дзяржынава — радзіма Фелікса Эдмундавіча. Так-так, таго самага, Дзяржынскага. На адноўленай родавай сядзібе зараз месціцца надзвычай цікавы музей. Тут можна ўбачыць, як жыла сям'я «жалезнага Фелікса» — заможная шляхецкая сям'я; даведацца, што ягоны брат Станіслаў быў забіты ў 1917 годзе, а яшчэ адзін брат, Казімір, — апошні гаспадар сядзібы — разам з жонкай быў расстраляны фашыстамі за сувязь з партызанамі. У тым жа 43-м падчас карнай аперацыі фашыстаў згарэў і драўляны дом з мезанінам...

Сярод экспанатаў музея — зусім невядомая скульптура работы Заіра Азгура — Дзяржынскі з беспрытульным дзіцем на руках. Дзіўна, праўда? Мы проста мала ведаем. Дзяржынскі — менавіта той чалавек, які ўзяў на сябе клопат па ўладкаванні дзяцей, што, кажучы сучаснай мовай, засталіся без апекі бацькоў у калатнечы Першай сусветнай, Грамадзянскай войнаў, рэвалюцыі. Яшчэ — а гэта ўжо дакладна

Фелікс Дзяржынскі, аказваецца, напісаў нямала кніг.

да тэмы нашай рубрыкі — у музеі ёсць стэнд з кнігамі, якія напісаў Фелікс Эдмундавіч. «Дзённік зняволенага. Пісьмы». На рускай, англійскай, французскай, іспанскай мовах. «Як нам змагацца», «Аб гаспадарчым будаўніцтве», «Прамысловасць СССР, яе дасягненні і задачы»... Нездарма кажуць, што і гэты ўраджэнец Стаўбцоўскага краю быў назвычай адукаваны і разнабаковы чалавек.

***

Ёсць мясціны, якім уласцівы дзівосны магнетызм. Стаўбцоўшчына, несумненна, — адна з такіх. Сюды варта прыехаць яшчэ і яшчэ — паслухаць незвычайна мяккую правільную мову, пастаяць каля чатырохсотгадовых простых храмаў, пагладзіць рукой кару старога дуба, пад якім Паэт напісаў першы верш, успомніць, адчуць і зразумець, як гэта можа быць увосень: «І ты маўчыш, маўчаць і далі. // Нібы ў адной агульнай хвалі,// Ў адной асветленай часіне // Жыццё злучыла свае плыні...»

Алена ЛЯЎКОВІЧ.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.